# УНУТРЫПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА 30-Х ГГ. XV СТ. У ВКЛ

**Мазько І.В, Буйніч В.Н.**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і рыдыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Янкоўскі Ю.Ю. – выкладчык*

Даследуецца барацьба за ўладу ў Вялікім княстве Літоўскім пасля смерці Вітаўта ў 1430 г., падзел краіны і ваенныя сутыкненні паміж Свідрыгайлам Альгердавічам і Жыгімонтам Кейстутавічам.

Пасля смерці Вітаўта ў 1430 г. адбыўся з'езд феадалаў ВКЛ, на якім вялікім князем літоўскім быў абраны Свідрыгайла. Ён быў братам Ягайлы і малодшым сынам Альгерда. У гэты ж час пачаў нарастаць унутраны канфлікт у ВКЛ. Супраць Свідрыгайлы сфармавалася моцная апазіцыя літоўскіх феадалаў на чале з малодшым братам Вітаўта Жыгімонтам Кейстутавічам. У аснове іх незадаволенасці ляжала палітыка Свідрыгайлы па раздаванні пасад выхадцам з усходу дзяржавы, у большасці праваслаўнага веравызнання.

Польскае Каралеўства аказала Жыгімонту ваенную дапамогу. Узамен ён заключыў з Польшчай новую унію, паводле якой пасля яго смерці Вялікае Княства Літоўскія пераходзіла да Ягайлы і яго нашчадкаў. Свідрыгайла атрымаў ваенную і палітычную падтрымку ад цвярскога князя і лівонскіх рыцараў. Тэўтонскія рыцары таксама абяцалі выступіць на яго баку.

1 верасня 1432 г. адбылася спроба забойства Свідрыгайлы ў Ашмянах, на чале змовы стаяў Жыгімонт Кейстутавіч. Невядома кім папярэджаны Свідрыгайла змог уцячы ў Полацак, дзе ў яго было шмат прыхільнікаў з ліку праваслаўнай шляхты. Да канца не зразумела, хто і чаму з асяродзьдзя Жыгімонта дапамог яму бегчы, але ініцыятыва перайшла ў рукі яго супернікаў. У Вільні вялікім князем літоўскім быў абвешчаны Жыгімонт Кейстутавіч, якога прызналі Літва, Жамойць, Падляшша, Панямонне, Брэсцкая і Менская землі. Нягледзячы на агульны першы поспех, Жыгімонту яшчэ трэба было расправіцца са сваім палітычным супернікам Свідрыгайлам, які не толькі не адмовіўся ад барацьбы, але наадварот, актывізаваў свае дзеянні. Уладу Жыгімонта не прызналі ва ўсходняй і паўднёвай частках Вялікага княства Літоўскага, дзе вялікім князем па-ранейшаму лічылі Свідрыгайлу. Акрамя гэтага, Свідрыгайла падтрымлівалі крыжакі, імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі і прадстаўнікі Залатой Арды. У выніку дзяржава была расколата на дзве часткі – Вялікае Княства Літоўскае і Вялікае Княства Рускае. На працягу трох гадоў бакі актыўна дзейнічалі як на полі бою, так і на дыпламатычным фронце.

8 снежня 1432 г. сілы супернікаў ізноў сустрэліся каля Ашмян. Абодва бакі панеслі вялікія страты, але перамога засталася за Жыгімонтам. У гэтым жа годзе войска Свідрыгайлы апынулася пад Вільняй. На наступны год Свідрыгайла захапіў Коўна, спаліў Заслаўе і Менск. У адказ Жыгімонт Кейстутавіч спрабаваў захапіць Віцебск і Мсціслаў. Зімой 1433 г. Свідрыгайла, сабраўшы вялікае рускае войска, адправіўся ў паход на карэнныя літоўскія гарады і замкі, якія прызналі вярхоўную ўладу вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча. Лівонскія рыцары, не чакаючы Свідрыгайлы, самастойна спустошылі памежныя літоўскія воласці. Хан Залатой Арды паабяцаў даслаць на дапамогу свайму саюзніку Свідрыгайле адборнае коннае войска, аднак галоўных ардынскіх сіл Свідрыгайла так і не дачакаўся.

1 верасня 1435 г. пад Вількамірам адбылася вырашальная бітва. У ёй браў удзел Свідрыгайла са сваімі сіламі і яго саюзнікі – рыцары Лівонскага ордэна, невялікі татарскі атрад, чэшскія і заходнееўрапейскія найміты. Сілы супернікаў былі амаль роўнымі і налічвалі прыблізна па 10 тыс. чалавек. Бітва скончылася для Свідрыгайлы катастрофай. Свідрыгайла з невялікай групай рыцараў збег у Полацк. Няўдачы Свідрыгайлы выклікалі незадаволенасць сярод яго прыхільнікаў. Беларускія і ўкраінскія землі адна за адной сталі пераходзіць на бок Жыгімонта. У выніку пад уладай Свідрыгайлы засталіся толькі Валынь і Падолле. Феадальная вайна завяршылася ў 1439 г., калі Валынь і Падолле прызналі ўладу Жыгімонта.

У выніку феадальнай вайны 1432–1439 гг. ВКЛ захавалася як адзіная дзяржава, але гарадам і вёскам былі прычынены вялікія страты. Загінула шмат князёў і знатных баяр, адбыўся пэўны перадзел феадальнай уласнасці, пашырыліся правы праваслаўнага баярства. Усходнебеларускія і ўкраінскія землі захавалі сваю аўтаномію. Супраць Жыгімонта выступіла частка літоўскай шляхты, у выніку чаго была арганізавана змова, і ён быў забіты 20 сакавіка 1440 г. ў Троцкім замку.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Kopystiański A. Michał Zygmuntowicz książę litewski. – Lwów: Drukarnia Ludowa, 1906. – 95 s.*
*2. Грыцкевіч А. Феадальная вайна 1432–1439 // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя . Т. 2. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2007. – С. 698–699.*
*3. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. Ч. 1. – Мінск: Беларусь, 1994. – 527 с.*